Zdanovič, U. V.

# Гісторыя германскага акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі Беларусі у сучаснай Беларускай гістарыяграфіі (1991-2007 гг.)

Szkice Podlaskie 16, 79-92

2008

Artykuł został zdigitalizowany i opracowany do udostępnienia w internecie przez Muzeum Historii Polski w ramach prac podejmowanych na rzecz zapewnienia otwartego, powszechnego i trwałego dostępu do polskiego dorobku naukowego i kulturalnego. Artykuł jest umieszczony w kolekcji cyfrowej bazhum.muzhp.pl, gromadzącej zawartość polskich czasopism humanistycznych i społecznych.

Tekst jest udostępniony do wykorzystania w ramach dozwolonego użytku.

MUZEUM HISTORII POLSKI

У.В. Здановіч
Рэспубліка Беларусь,
Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна

# ГІСТОРЫЯ ГЕРМАНСКАГА АКУПАЦЫЙНАГА РЭЖЫМУ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ (1991-2007 гг.)

У артыкуле аналізуюцца працы сучасных беларускіх гісторыкаў, прысвечаныя акупацыйнай палітыцы германскіх улад на часова акупіраванай тэрыторыі Беларусі. Падкрэсліваецца, што характэрнай асаблівасцю адзначанага перыяду стала засваенне новых накірункаў у даследаванні праблемы, дэталёвае асвятленне разнастайных аспектаў акупацыйнага рэжыму, разгляд якіх ў савецкай гістарыяграфіі вызначаўся лаканічнасцю. Сярод маладаследаваных сюжэтаў аўтар выдзяляе гісторыю асобных канцэнтрацыйных лагераў, генацыд у адносінах да яўрэйскага насельніцтва, прымусовая праца грамадзян рэспублікі, пытанні арганізацыі акупацыйнымі ўладамі медыцынскага абслугоўвання насельніцтва, школьнай адукацыі, праблему калабарацыі.

Пасля распаду СССР у гісторыкаў з'явіліся новыя магчымасці для вывучэння акупацыйнай палітыкі германскіх улад на тэрыторыі Беларусі. Характэрнай асаблівасцю стала засваенне новых накірункаў у даследаванні праблемы, а таксама дэталёвае асвятленне разнастайных аспектаў акупацыйнага рэжыму, разгляд якіх у савецкай гістарыяграфіі вызначаўся лаканічнасцю.

У 1990-я гг. – пачатку 2000-х гг. асаблівую актуальнасць набывае гісторыя асобных лагераў, якія ў ранейшыя часы па розных прычынах, у першую чаргу ідэалагічных заставаліся фактычна паза межамі фундаментальнага навуковага даследавання. Так, доўгі час грунтоўна не вывучалася гісторыя Трасцянца, нягледзячы на тое, што Трасцянецкі лагер быў самым буйным на тэрыторыі Беларусі і адным з буйнейшых у Еўропе месцам масавага знішчэння людзей. Не сталі ў поўнай меры здабыткам навуковай супольнасці матэрыялы сабраныя камісіяй па стварэнню Хатынскага мемарыялу і супрацоўнікамі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Аб узрастаючай цікавасці навукоўцаў да праблем Трасцянца сведчаць матэрыялы Міжнароднай канферэнцыі "Генацыд у другой сусветнай вайне: праблемы даследавання (у памяць ахвяр Трасцянца)", праведзеная ў БДУ 25-27 красавіка 2002 г. [6].

Найбольш важныя праблемы ў даследаванні гісторыі Трасцянецкага лагера вызначыў, выступаючы 24 кастрычніка 2003 г. на міжнароднай канферэнцыі "Мінскае гетта. 1941 – 1943 гг.: Трагедыя. Гераізм. Памяць", арганізаванай супрацоўнікамі гістарычнай майстэрні ў Мінску, Міжнароднага адукацыйнага цэнтра ў Дортмундзе (Германія), Саюза беларускіх яўрэйскіх грамадскіх аб'яднанняў і абшчын Мінскага міжнароднага адукацыйнага цэнтра А.М. Літвін. Як справядліва падкрэсліў даследчык, вельмі складаным у вывучэнні тэмы з'яўляецца пытанне аб агульнай колькасці знішчаных у Трасцянцы людзей. Прынятая ў гістарыяграфіі лічба аб 206500 чалавек з'яўляецца заніжанай. А.М. Літвін, са спасылкай на дадзеныя акта камісіі па вывучэнню ахвяр Трасцянецкага лагера, у склад якой уваходзілі В.І. Казлоў, М. Лынькоў і іншыя, паказвае, што згодна акта складзенага камісіяй 25 ліпеня 1944 г. у Трасцянцы было знішчана 546 тысяч чалавек [19, с. 65]. Аднак у далейшым лічба пастаянна змяншалася. Нягледзячы на тое, што дадзеныя аб звыш 206 тысячах знішчаных у Трасцянцы пастаянна крытыкаваліся навукоўцамі, яны так і не былі перагледжаны. Аб гэтым, у прыватнасці, сведчыць зборнік дакументаў і матэрыялаў "Нямецка-фашысцкі генацыд на Беларусі (1941– 1944)", выдадзены ў 1995 г. у якім гаворыцца, што ў в. Малы Трасцянец акупанты знішчылі 206500 тысяч чалавек [21]. Дадзеная лічба прысутнічае і ў калектыўным выданні "Беларусь в годы Великой Отечественной войны" [1, с. 158]. Пэўная ўвага навукоўцамі ў разглядаемы перыяд надавалася вывучэнню Азарычскага лагера смерці. Самай значнай працай па дадзенай праблеме з'яўляецца кніга "Озаричи – лагерь смерти".

Адносна новым накірункам даследаванняў беларускіх гісторыкаў стала тэма нацысцкага генацыду ў адносінах да яўрэйскага насельніцтва. Знішчэнне яўрэяў ў гады Другой сусветнай вайны атрымала назву Халакост, Катафалк. У сучаснай беларускай гістарыяграфіі найбольш распаўсюджаным тэрмінам з'яўляецца генацыд – фізічнае знішчэнне асобных груп насельніцтва па расавых, нацыянальных, этнічных і рэлігійных прыкметах. Увядзенне ў пачатку 1990-х гг. у навуковы ўжытак новых дакументаў садзейнічала таму, што ў навуковых колах узрасла цікавасць да азначанай праблемы. Як сведчаць і апублікаваныя крыніцы большасць беларускіх яўрэяў загінула, з'яўляючыся вязнямі гета, якія існавалі як у буйных гарадах, так і пасёлках і вёсках. Менавіта гісторыя гета стала найбольш распрацоўваемай тэмай у беларускай гістарыяграфіі. Пацвярджэннем таму з'яўляюцца канферэнцыі, праведзеныя ў рэспубліцы: "Мінскае гета. 1941–1943 гг.: Трагедыя. Гераізм.

Памяць"; "Генацыд у другой сусветнай вайне: праблемы даследавання (у памяць ахвяр Трасцянца)"; "Беларусь у выпрабаваннях Вялікай Айчыннай вайны: масавыя забойствы нацыстаў"; "Лагер смерці Трасцянец 1941 – 1944 гг.: памяці ахвяр нацызму ў Беларусі"; "Першая і другая сусветная войны: акупацыя і яе наступствы на Беларусі"; "Чужыя і родныя: формы выжывання ва ўмовах Другой сусветнай вайны" [2].

Праблема халакосту ў Беларусі знайшла адлюстраванне і ў манаграфічнай і навукова-папулярнай літаратуры. Сярод даследчыкаў дадзенай тэмы неабходна выдзеліць працы Э.Р. Іофе [9]. Як паказвае аналіз прац, прысвечаных гісторыі яўрэйства перыяду Другой сусветнай вайны асноўная ўвага гісторыкаў была накіравана на паказ карнай дзейнасці германскіх улад. Сацыяльна-эканамічная палітыка ў адносінах да яўрэйскага насельніцтва разглядалася ў агульным плане, фрагментарна без вызначэння яе сутнасці і канкрэтных накірункаў, без пацвярджэння яе вынікаў канкрэтнымі дадзенымі.

Аднабаковае асвятленне праблемы ў пэўнай ступені было пераадолена аўтарамі манаграфіі "Пинские евреи. 1939–1944 гг." [23]. Значная крыніцазнаўчая база, выкарыстанне элементаў параўнальнага аналізу дзейнасці акупацыйных улад у дачыненні да розных нацыянальных груп дазволілі гісторыкам паказаць на прыкладзе аднаго горада Беларусі асноўныя накірункі сацыяльна-эканамічнай палітыкі акупантаў у адносінах да яўрэйскага насельніцтва, вызначыць яе этапы і прасачыць змяненні ў становішчы яўрэяў горада.

Разнастайныя аспекты жыцця яўрэйскага насельніцтва ў перыяд нямецкай акупацыі на прыкладзе значна большага рэгіёна асвятліў у кандыдацкай дысертацыі адзін з аўтараў папярэдняй манаграфіі Я.С. Разенблат. Выкарыстанне даследчыкам раней недаступных для гісторыкаў архіўных дакументаў дало магчымасць паказаць не толькі сутнасць і вынікі нацысцкай палітыкі генацыду ў адносінах да жыхароў яўрэйскай нацыянальнасці на тэрыторыі Заходняй Беларусі, але і раскрыць ролю органаў яўрэйскага самакіравання як у рашэнні пытанняў жыццязабеспячэння насельніцтва, так і ў выкананні загадаў акупацыйных улад, што на наш погляд надае асаблівую значнасць даследаванню [22].

Аб'ектам даследавання беларускіх гісторыкаў у постсавецкі перыяд стала прымусовая праца грамадзян Беларусі. У савецкія часы ўвага даследчыкаў фіксавалася пераважна на пытанні прымусовага вывазу беларусаў у Германію. Пры гэтым дадзеная праблема не з'ўлялася тэмай вывучэння беларускім навукоўцамі, а

разглядалася ў кантэксце акупацыйнай эканамічнай палітыкі. Па-за ўвагай даследчыкаў заставаліся арганізацыя прымусовай працы на акупіраванай тэрыторыі, формы і метады прымусу, матэрыяльнае, прававое становішча насельніцтва, роля мясцовай калабарацыі ў працэсе вывазу жыхароў Беларусі ў нацысцкія краіны. Па сутнасці забароненай былі і праблема невяртання на радзіму былых остарбайтараў.

Са змяненнем грамадска-палітычнай сітуацыі пасля распаду СССР з'явіліся новыя магчымасці для вывучэння акупацыйнага рэжыму і такой яго састаўной часткі, як выкарыстанне савецкіх грамадзян на прымусовых работах. Аб'ектыўнаму і ўсебаковаму асвятленню тэмы спрыяла павялічэнне крыніцазнаўчай базы. Значным дасягненнем стала выданне ў некалькі кнігах зборніка дакументаў і матэрыялаў "Белорусские остарбайтеры. Угон населения Беларуси на принудительные работы в Германию (1941–1944)", а таксама зборнік "Остарбайтеры. Принудительный труд белорусского населения в Австрии", якія даюць уяўленне аб становішчы вывезеных грамадзян Беларусі, а таксама раскрываюць палітыку савецкай улады ў дачыненні да рэпатрыянтаў.

Паспяховаму засваенню выдадзеных дакументаў садзейнічала аналітычнае даследаванне "Беларускія остарбайтары", падрыхтаванае супрацоўнікамі Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь [4].

Увядзенне ў навуковы ўжытак новых дакументаў, пашырэнне крыніцазнаўчай базы аб'ектыўна павышала ўзровень навуковых даследаванняў. Палітыка прымусовай працы, ажыццяўляемая германскімі акупацыйнымі ўладамі на тэрыторыі Беларусі атрымала грунтоўнае асвятленне ў кандыдацкай дысертацыі Я.А. Грэбеня [7].

У асобны накірунак даследаванняў у 1990-я гг. выдзелілася аграрная палітыка захопнікаў, якая ў савецкія часы разглядалася ў кантэксце вывучэння эканамічных мерапрыемстваў акупантаў на беларускай зямлі. Зменам у аграрным сектары заходніх абласцей Беларусі ў перыяд акупацыі прысвечаны асобны раздзел ў кандыдацкай дысертацыі і манаграфіі В.А. Белазаровіча [3]. Як справядліва адзначае аўтар, захопнікі разглядалі рэгіён у якасці аграрна-сыравіннага прыдатка Германіі. Абавязковыя пастаўкі сельскагаспадарчай прадукцыі на патрэбы германскай арміі ў спалучэнні з карнымі экспедыцыямі і рэпрэсіямі, каланізацыя тэрыторыі перасяленцамі з Германіі і Галандыі, прывялі да масавага збяднення заходнебеларускай вёскі. Не палепшыла становішча і аграрная рэформа 1942 г. У 1943 г. у заходніх абласцях

рэспублікі 240 тысяч га не былі апрацаваны, а 10-15 % сямей згубілі апошнюю карову.

Уяўленні даследчыкаў аб сутнасці аграрнай палітыкі акупацыйных улад , механізм яе ажыццяўлення на тэрыторыі Заходняй Беларусі істотна дапоўніла С.Л. Казлова [13], якая на падставе разнастайных крыніц, у тым ліку і матэрыялаў, выяўленых у архівах Федэратыўнай Рэспублікі Германіі, даказала, што важнейшай састаўной часткай акупацыйных мерапрыемстваў была сельскагаспадарчая каланізацыя і анямечванне заходнебеларускіх тэрыторый. Аднак, негатыўнае стаўленне насельніцтва да захопнікаў, пастаянна ўзрастаючы партызанскі рух прывялі да зрыву планаў нямецкага кіраўніцтва.

Пры аналізе акупацыйнага рэжыму нельга абыйсці ўвагай працы Ю. Туронка і Б. К'яры [26, 10]. Так, польскі даследчык на падставе прынцыпу параўнальнага аналізу сацыяльна-эканамічных і палітычных працэсаў, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі ў гады першай сусветнай і Другой сусветнай войнаў, раскрывае структуру, асноўныя накірункі дзейнасці найбольш значных ваенных і грамадзянскіх органаў улады і фарміраванняў.

Б. К'яры, які адным з першых германскіх гісторыкаў пачаў вывучаць гісторыю Беларусі перыяду нямецкай акупацыі ў 1941–1944 гг., падкрэслівае, што акупацыйны рэжым на тэрыторыі рэспублікі меў больш жорсткі характар у параўнанні з іншымі рэгіёнамі СССР. З самага пачатку акупацыі ў Беларусі дамінавалі голад, тэрор, якія сталі прычынамі вялікіх людскіх ахвяр, агульнай колькасцю 1,6 мільёнаў чалавек. Шматлікія матэрыялы пацвярджаюць выснову нямецкага гісторыка аб тым, што Беларусь была самым жахлівым прыкладам спалучэння ваеннай эканомікі, аграрнай вытворчасці і харчовага становішча з нацысцкімі метадамі вядзення вайны на вынішчэнне, асабліва з германскім рэжымам тэрору, які разбуральна ўздзейнічаў на ўсе групы мясцовых жыхароў Беларусі [10].

Істотныя змены грамадска-палітычнага характару пачатку 1990-х гг. стымулявалі вывучэнне забароненых тэм ваеннай гісторыі, сярод якіх выдзяляецца праблема калабарацыянізму. Значнай для вывучэння тэмы стала выдадзеная на беларускай мове кніга польскага даследчыка Ю. Туронка [26]. Выкарыстанне дакументаў, выяўленых у архівах ЗША, Германіі, Польшчы, матэрыялаў перыядычных выданняў ваенных часоў, мемуарнай літаратуры, у тым ліку і дзеячаў калабарацыі на тэрыторыі Беларусі, дазволілі аўтару паказаць праблему ў нязвыклым для беларускай навуковай грамадскасці ракурсе. Паводле меркавання даследчыка, працэс палітычнай палярызацыі беларускага грамадства няспынна

ўзмацняўся, няглeдзячы на злачынствы акупантаў, непазбежнасць паражэння Германіі, вяртання савецкай улады. Не ўжываючы тэрмін "калабарацыянізм", Ю. Туронак падрабязна аналізуе дзейнасць разнастайных калабаранцкіх арганізацый, адзначае, што на беларускіх землях, якія не ўваходзілі ў Генеральную акругу Беларусь, іх уплыў не быў такі адчувальны. Няглeдзячы на тое, што нацыяналісты "не бачылі перад сабой абяцанай перспектывы" [26, с. 200], іх дзейнасць, на думку гісторыка, апраўдана з пункту гледжання нацыянальных інтарэсаў, таму што "стварыла магчымасці для ўзмацнення і распаўсюджання нацыянальнай свядомасці, для арганізацыі нацыянальнага грамадскага жыцця" [26, с. 199]. Як паказвае змест працы, у прыведзеных аўтарам матэрыялах ёсць шэраг недакладнасцяў. Асабліва гэта адносіцца да прыведзеных у кнізе лічбавых паказчыкаў. На наш погляд, гэта тлумачыцца тым, што ў многіх выпадках гісторык спасылаецца на дакументы акупацыйных уладаў, ці мемуарную літаратуру і неправодзіць верыфікацыю гэтых крыніцаў. Як вядома, асаблівасцю статыстычных дадзеных з'яўляецца завышэнне сваіх поспехаў і заніжэнне дасягненняў праціўніка.

Разнастайныя аспекты супрацоўніцтва сталі тэмай даследавання А.М. Літвіна. З прыцягненнем шырокай крыніцазнаўчай базы гісторык прааналізаваў дзейнасць Беларускай Краёвай Абароны, Беларускай Самапомачы, Саюза беларускай моладзі, Беларускай Самаахoвы і іншых арганізацый. Новыя метадалагічныя падыходы пры даследаванні калабарацыі на Беларусі дазволілі аўтару правесці градацыю тых, хто па розных прычынах пайшоў на супрацоўніцтва з акупантамі. Даследчык пры характарыстыцы беларускай калабарацыі, як нам падаецца, абгрунтавана і доказна выдзяляе тры састаўляючыя: 1. Тыя беларускія сілы, якія былі ў адкрытай і патаемнай апазіцыі да бальшавізму. Адкрытыя апазіцыянеры – гэта ў асноўным беларускія эмігранты, якія да 1939 г. пражывалі за межамі і вялі адпаведную працу ў гэтым накірунку. На правым фланзе гэтых сіл была Беларуская нацыянал-сацыялістычная партыя (беларускія фашысты на чале з Ф. Акінчыцам). Пасля захопу Германіяй Польшчы, калі стала відавочнай вайна з СССР, да супрацоўніцтва з немцамі сталі схіляцца прадстаўнікі іншых партый і арганізацый, разлічваючы з іх дапамогай тварыць адраджэнне Беларусі. 2. Тыя, хто да вайны жыў на тэрыторыі БССР і хто паверыў немцам ці іх супольнікам, свядома пайшоў на службу. Сярод іх было шмат пакрыўджаных савецкай уладай і тых, каго можна аднесці да патаемнай апазіцыі. 3. Да трэцяй групы аднесены тыя, хто абставінамі лёсу апынуўся ў сувязі з першай ці другой групамі, або

на службе ў акупантаў і быў пазбаўлены іншага выбару. Касцяком беларускай калабарацыі была першая група. Яе можна таксама лічыць палітычнай (ідэалагічнай) калабарацыяй [17, с. 199].

Акрамя палітычнай, аўтар выдзяляе таксама эканамічную і ваенную калабарацыю. Несумненнай заслугай гісторыка з'яўляецца вызначэнне колькасці калабарантаў. Па падліках А.М. Літвіна, агульны лік людзей, якія мелі дачыненні да калабарацыі на тэрыторыі Беларусі з улікам усходніх і каўказскіх батальёнаў, паліцыі парадку, паліцэйскіх украінскіх, літоўскіх, беларускіх і г.д. батальёнаў, фарміраванняў БСА і БКА складалі болей за 130 тысяч чалавек [17, с. 251].

Найбольш шматлікай групай з'яўлялася ваенная калабарацыя, якая стала тэмай доктарскай дысертацыі, абароненай у 2005 г. [18].

Значны ўклад у распрацоўку праблемы калабарацыі ўнёс беларускі гісторык А.А. Каваленя [14]. Разглядаючы палітычны аспект акупацыйнага рэжыму, аўтар выдзяляе тры асноўныя накірункі калабарацыі: ідэйнае супрацоўніцтва (палітычныя і грамадскія аб'яднанні арганізацыі і г.д.), свядомае супрацоўніцтва (служба ў разнастайных органах) і прымусовае супрацоўніцтва (адміністрацыйна-гаспадарчыя органы і прадпрыемствы) [14, с. 71-72].

Асноўным накірункам даследаванняў А.А. Кавалені стала жыццё моладзі ў гады вайны. Пэўная колькасць маладога пакалення рэспублікі па розных прычынах пайшла на супрацоўніцтва і выязджала на працу ў Германію. Вытокі, заснаванне, палітычная сутнасць і структурная пабудова, колькасны склад, дзейнасць прагерманскіх саюзаў моладзі на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў 1941-1944 гг. грунтоўна раскрыты ў доктарскай дысертацыі і аднайменнай манаграфіі аўтара [11, 12].

На акупаванай тэрыторыі рэспублікі былі створаны Саюз беларускай моладзі, Беларуская служба Бацькаўшчыны, Саюз рускай моладзі, Саюз татарскай моладзі і Саюз барацьбы супраць бальшавізму. Найбольшым аўтарытэтам карыстаўся Саюз беларускай моладзі. Аднак А.А. Каваленя не падтрымлівае Ю. Туронка, які сцвярджае, што дадзеная арганізацыя мела вялікую падтрымку ў падрастаючага пакалення Беларусі. Завышанай з'яўляецца і агульная ацэнка колькасці членаў СБМ. Згодна дадзеных польскага даследчыка, у Саюзе да канца 1943 года налічвалася да 40 тысячаў, а ў сярэдзіне 1944 – да 100 тысячаў чалавек [26, с. 186]. Кіраўнік СБМ М. Ганько ў "Беларускай газэце", на якую часта спасылаецца Ю. Туронак, паведамляў, што ў радах Саюза беларускай моладзі ў сярэдзіне 1944 г. налічвалася каля 7

тысяч юнакоў і дзяўчат [5, с. 427]. Паводле падлікаў А.А. Кавалені ў радах Саюза беларускай моладзі налічвалася каля 13 тысяч чалавек [11, с. 29]. Прычыну такога разыходджання колькасных паказчыкаў даводзіцца шукаць у разнастайнасці крыніцаў і некрытычным падыходзе да іх. На наш погляд, дадзеныя, атрыманыя А.А. Каваленяй на падставе архіўных дакументаў і ўспамінаў былых кіраўнікоў СБМ, з'яўляюцца больш набліжанымі да ісціны. Разам з тым, колькасць маладых людзей, якія мелі дачыненне да арганізацыі, але афіцыйна не лічыліся яе членамі, будзе большая.

У шэрагу прац разглядаецца дзейнасць асобных калабаранцкіх партый і арганізацый. Так, гісторыю заснавання і дзейнасці Беларускай незалежніцкай партыі паказаў С. Ёрш у сваёй кнізе "Вяртанне БНП". Падрыхтаваная пераважна на апублікаваных працах, у першую чаргу эміграцкіх, і крыніцах даследаванне не дае поўнага ўяўлення пра згаданую партыю. Адсутнасць дакладных звестак прымушаюць аўтара пры характарыстыцы БНП ужываць такія выразы, як "пакуль не спраўджана", "наўрад ці", "ці сапраўды", "існуюць іншыя трактоўкі" [8, сс. 14, 16, 83], што значна зніжае навуковую каштоўнасць выдання. Дадзены факт ўскосна прызнае і сам даследчык, адзначаючы, што аб дзейнасці беларускай незалежніцкай партыі "вядома вельмі мала", шмат якія эпізоды яе дзейнасці супярэчліва апісваюцца гісторыкамі, а некаторыя застануцца таямніцай… У выніку гісторыя разглядаецца… больш па легендах ды ўспамінах людзей чымсьці па дакументах [8, с. 9].

Стварэнню і дзейнасці Беларускай Цэнтральнай Рады прысвяціў сваю манаграфію А.К. Салаўёў [25].

Ролю інтэлігенцыі ў калабаранцкім асяроддзі грунтоўна раскрыў У.І. Кузьменка, які канстатуе наяўнасць побач з масавай барацьбой супраць акупантаў у рэспубліцы і існаванне і зусім іншых настрояў. На службу да захопнікаў пайшлі як прадстаўнікі беларускай эміграцыі, так і мясцовае насельніцтва, якое пацярпела ад рэпрэсіўнай палітыкі І.В. Сталіна. Частка насельніцтва заняла пазіцыю чакання і не жадала ісці ні да партызан, ні ў паліцыю. Аднак, як справядліва падкрэслівае аўтар, ваенная рэальнасць не лічылася з такімі намерамі і ўцягвала многіх у падзеі без іх ведама і жадання.

Слушнай з'яўляецца заўвага гісторыка аб тым, што сёння цяжка разабрацца, што з'яўлялася галоўным у кіраўніцтва калабаранцкімі арганізацыямі і структурамі: сапраўдны нацыянальны ідэалізм ці падкантрольнасць нямецкім спецслужбам, "замбіраванасць" імі. Несумненна, што побач з "узнёслымі ідэалістамі" у калабарацыі знаходзіліся палітыканы і

авантурысты, якія шукалі любой улады і поспеху, гатовых "дзеля гэтага служыць каму заўгодна" [16, с. 137].

Маладаследаваным у гісторыі застаецца пытанне пра яўрэйскую калабарацыю. Аналіз апублікаваных прац, прысвечаных становішчу яўрэйскага насельніцтва ў гады Вялікай Айчыннай вайны, дае падставы сцвярджаць, што да калабаранцкіх арганізацый можна аднесці юдэнраты – органы яўрэйскага самакіравання. Юдэнраты займаліся дзейнасцю, якая садзейнічала стварэнню, хоць і мінімальных, але неабходных умоў жыцця. З другога боку, яўрэйскія саветы, інтэграваныя ў нацысцкі апарат кіравання, з'яўляліся праваднікамі палітыкі рабавання і эксплуатацыі яўрэйскага насельніцтва. Яўрэйская паліцыя не толькі праводзіла вобыскі ў дамах жыхароў гета, але нават удзельнічала ў пагромах і расстрэлах. Аспект супрацоўніцтва юдэнратаў з акупацыйнымі ўладамі закранаецца ў працах М.Я. Саваняка, Э.Р. Іофе, К.І. Козака, І.Э. Яленскай і Я.С. Разенблата і інш [9, 15, 22, 23, 24].

Я.С. Розенблат першым з айчынных гісторыкаў назваў юдэнраты калабаранцкімі арганізацыямі. У дысертацыйным даследаванні аўтар адзначае, што "юдэнраты з'явіліся першым фіскальным органам, праваднікам палітыкі рабавання і эксплуатацыі яўрэйскага насельніцтва, своеасаблівым "прыводным рэмнём" палітыкі генацыду", што дазваляе гаварыць пра элементы калабарацыянізму ў дзейнасці юдэнратаў" [22, с. 3].

На акупіраванай тэрыторыі адбываліся складаныя нацыянальна-дзяржаўныя працэсы. За дзяржаўнасць Беларусі вялі змаганне дзве асноўныя супрацьлеглыя сілы. Першы вектар складалі прыхільнікі савецкага дзяржаўнага ладу, якія абапіраліся на арганізаваны партызанскі і падпольны рух. Прадстаўнікі другога лагеру разлічвалі пабудаваць беларускую дзяржаву, здзейсніць сацыяльна-палітычныя перамены пры дапамозе і пад пратэктаратам Германіі. Ідэолагамі дадзенай праграмы выступалі кіраўнікі калабаранцкіх структур БНП, БЦР, БСА, БКА, СБМ, ваенна-паліцэйскіх фарміраванняў. Праблема беларускай дзяржаўнасці знайшла адлюстраванне ў працах А.А. Кавалені, А.М. Літвіна, К.І. Козака [12]. Пададзены даследчыкамі матэрыял сведчыць аб тым, што ў мэтах нацысцкага кіраўніцтва Германіі не прадугледжвалася захаванне незалежнай Беларусі. Наадварот, у часы акупацыі беларускі народ страціў не толькі дзяржаўную, але і тэрытарыяльную цэласнасць. І толькі барацьба насельніцтва супраць акупантаў пры велізарных людскіх стратах дазволіла захаваць Беларусь.

Адным з актуальных накірункаў даследчыцкай працы беларускіх гісторыкаў стала гістарыяграфічная рапрацоўка праблем акупацынага рэжыму на тэрыторыі Беларусі. Самай значнай працай па тэме з'яўляецца манаграфія К.І. Козака "Германский оккупационный режим на территории Беларуси. 1941-1944 гг.: историография и источники"[15].

Шэраг аспектаў вывучэння акупацыйнага рэжыму закранаў у сваіх публікацыях С.Я. Новікаў, асноўнай гістарыяграфічнай тэмай якога з'яўляецца аналіз прац сучасных нямецкіх гісторыкаў, прысвечаных палітыцы нацысцкай Германіі ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны [20].

Такім чынам, гісторыкамі праведзена значная праца па вывучэнні акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі Беларусі ў 1941-1944 гг. Многія аспекты праблемы атрымалі грунтоўнае асвятленне ў літаратуры. Найбольш поўна распрацаваны пытанні прымусовага вывазу і ўтрымання грамадзянскага насельніцтва, іх знішчэнне ў канцлагерах і гета, карных экспедыцыях, ажыццяўляемых ваенным і палітычным кіраўніцтвам Германіі на тэрыторыі рэспублікі.

Разам з тым, аналіз літаратуры паказвае, што асобныя пытанні патрабуюць дадатковага асэнсавання. Для разумення праблемы дзейнасці акупацыйных структур неабходна далейшая дэталёвая прапрацоўка паняційнага апарату акупацыйнага рэжыму. Асаблівае значэнне гэта мае пры вызначэнні колькасці людскіх страт у перыяд акупацыі. Акрамя самай распаўсюджанай у савецкай гістарыяграфіі лічбы ў 2 мільёна 200 тысяч чалавек, вызначанай Надзвычайнай дзяржаўнай камісіяй, у гістарычнай літаратуры сустракаюцца і іншыя дадзеныя дэмаграфічных страт Беларусі – 3 мільёны, 4 мільёны, 3,5 мільёны, 2,5 мільёны, 3,4 мільёны. Патрабуюць удакладнення і беззваротныя страты яўрэйскага насельніцтва. Больш грунтоўнага вывучэння патрабуе і праблема савецкіх ваеннапалонных, іх жыццё ў канцэнтрацыйных лагерах, колькасць загінуўшых на тэрыторыі рэспублікі. Для выяўлення сутнасці акупацыйнай палітыкі патрэбна і асвятленне штодзённага жыцця розных катэгорый насельніцтва Беларусі ў жорсткіх і складаных умовах акупацыі, іх узаемаадносіны з германскімі органамі і ўстановамі.

Беларускімі даследчыкамі праведзена пэўная праца па вывучэнні праблемы калабарацыі. У гістарыяграфічны ўжытак былі ўведзены паняцці "калабарацыянізм", "калабарацыя". Гісторыкі адышлі ад агульна-абвінаваўчага ўхілу ў вывучэнні супрацоўніцтва з германскімі ўладамі, паспрабавалі разабрацца ў пабуджальных матывах калабарацыі. Пераважная большасць

айчынных навукоўцаў вызначае калабарацыю як з'яву якая была ў значнай ступені выклікана перадваеннай палітыкай сталінскага кіраўніцтва, мела ў гады вайны разнастайныя ваенныя, палітычныя, эканамічныя, сацыяльныя формы і ўзмацняла структуры акупацыйнага рэжыму ў Беларусі.

У некаторых працах калабаранты прадстаўлены не толькі як саюзнікі Германіі, а як нацыянал-патрыёты, якія спрабавалі выкарыстаць адукацыйныя органы для аднаўлення беларускай дзяржаўнасці. У публіцыстычных выданнях аўтары пачалі паказваць беларускіх калабарантаў барацьбітамі за нацыянальную культуру і дзяржаўнасць.

BIBLIOGRAFIA


1. Беларусь в годы Великой Отечественной войны.1941-1945 гг. / А.А. Коваленя (руководитель авторского коллектива), А.М. Литвин, В.И. Кузьменко и др. – Минск: Белта, 2005. – 554 с.
2. Беларусь у выпрабаваннях Вялікай Айчыннай вайны: масавыя забойствы нацыстаў: матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 2 ліпеня 2005 г. / Гістарычная майстэрня ў Мінску, Міжнародны адукацыйны цэнтр у Дортмундзе і інш.: адк. рэд. В.Ф. Балакіраў, К.І. Козак. – Мінск, 2005. – 306 с. ; Лагер смерці Трасцянец 1941 – 1944 гг.: памяці ахвяр нацызму ў Беларусі: матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф. Мінск, 10 лістапада 2004 г. / Гістарычная майстэрня ў Мінску, Міжнародны адукацыйны цэнтр у Дортмундзе і інш.: адк. рэд. В.Ф. Балакіраў, К.І. Козак. – Мінск, 2005. – 316 с. ; Першая і другая сусветная войны: акупацыя і яе наступствы на Беларусі: матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф. Мінск, 22 кастрычніка 2005 г. / Гістарычная майстэрня ў Мінску, Міжнародны адукацыйны цэнтр у Дортмундзе і інш.: адк. рэд. В.Ф. Балакіраў, К.І. Козак. – Мінск, 2006.
3. Белозорович, В. А. Аграрные преобразования в западных областях Беларуси в 1939 – 1952 годах: автореф. ... дис. канд. ист. наук: 07.00.02 / В.А.Белозорович.; Белорус. гос. педаг. ун-т. – Минск, 1999. – 15 с.
4. Белорусские остарбайтеры : историко-аналитическое исследование / Г. Д. Кнатько, В. И. Адамушко, Н. А. Бондаренко, В. Д. Селеменев; под ред. Г.Д. Кнатько. – Минск: НАРБ, 2003, – 324 с.
5. Война в тылу врага. О некоторых проблемах истории советского партизанского движения в годы Великой Отечественной войны

/ авт. В. И. Андрианов [и др.]. – Вып. 1. – М. : Политиздат, 1974. – 447 с.
6. Генацыд у другой сусветнай вайне: праблемы даследавання (у памяць ахвяр Трасцянца) : матэрыялы міжнар. канф., Мінск, 25-27 красавіка 2002 г. / Беларус. дзярж. ун-т; адк. рэд. К. І. Козак, А. М. Літвін, У. Н. Сідарцоў. – Мінск, 2003. – 279 с.
7. Гребень, Е. А. Привлечение нацистской Германией граждан Беларуси на принудительные работы (1941 – 1944 гг.) : автореф. … дис. канд. ист. наук: 07.00.02 / Е. А. Гребень ; Белору. гос. ун-т. – Минск, 2005. – 16 с.
8. Ёрш, С. Вяртанне БНП / С. Ёрш. – Мінск, 1998.
9. Иоффе, Э. Г. Страницы евреев Беларуси: краткий научно-попул. очерк / Евр. ун-т в Минске / Э. Г. Иоффе. – Минск : Арти-Фекс, 1996. – 162 с. ; Иоффе, Э. Г. Белорусские евреи: трагедия и героизм. 1941 – 1945. / Э. Г. Иоффе. – Минск ; 2003. – 428 с.; Иоффе, Э. Г. По достоверным источникам. Евреи в истории городов Беларуси / Э. Г. Иоффе. – Минск:, 2001.
10. К'яры, Б. Штодзённасць за лініяй фронту. Акупацыя, калабарацыя і супраціў у Беларусі (1941–1944 гг.) : Пер. з ням. Л. Баршчэўскага ; навук. рэд. Г. Сагановіч / Б. К'яры. – Мінск, 2005. – 390 с.
11. Каваленя, А. А. Прагерманскія саюзы моладзі Беларусі. 1941–1944. Вытокі. Структура. Дзейнасць : аўтарэф. … дыс. докт. гіст. навук : 07.00.02 / А. А. Каваленя ; Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск, 2000. – 38 с.
12. Каваленя, А. А. Прагерманскія саюзы моладзі Беларусі. 1941-1944. Вытокі. Структура. Дзейнасць: / А. А. Каваленя. – Мінск: БДПУ імя М. Танка, 1999. – 260 с. ; Каваленя, А. А. Беларусь у гады другой сусветнай вайны (1939 – 1945) / А. А. Каваленя. – Мінск: БДПУ, 1996. – 183 с.; Каваленя, А. А. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны. 1941 – 1944 гг. (Некаторыя аспекты тэрытарыяльных, ваенна-палітычных і нацыянальна-дзяржаўных працэсаў / А. А. Каваленя // Беларуская дзяржаўнасць: вопыт XX стагоддзя : матэрыялы міжнар. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 18-19 крас. 2003 г. / Беларус. дзярж.-педаг. ун-т : навук. рэд.: П. І. Брыгадзін і інш. – Мінск, 2004.– С. 94-102; Козак, К. І. Беларуская дзяржаўнасць у гады другой сусветнай вайны: палітычныя, сацыяльныя і эканамічныя аспекты / К. І. Козак // Беларуская дзяржаўнасць: вопыт XX стагоддзя: Матэрыялы міжнар. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 18-19 крас. 2003 г. / Беларус. дзярж.-педаг. ун-т: навук. рэд.: П. І. Брыгадзін і інш. – Мінск, 2004. – 268 с. – с. 102-108 ; Козак, К.И. Политическая колаборация в Беларуси (1941 – 1944) / К. И. Козак // Беларусь і

Германія: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 2002 г.; рэдкал.: А.А. Каваленя (гал. рэд.), С.Я. Новікаў (нам. гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: МДЛУ, 2002. – с. 70-78.
13. Казлова, С. Л. Аграрная палітыка нямецкіх акупацыйных улад на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі (1941–1944 гг.) : аўтарэф. … дыс. канд. ист. наук: 07.00.02 / С. Л. Казлова ; Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 2006. – 22 с.
14. Коваленя, А. А. Беларусь 1939-1945 гг. Война и политика / А. А. Коваленя. – Минск : Веды, 2001. – 204 с.
15. Козак, К. И. Германский оккупационный режим на территории Беларуси. 1941-1944 гг.: историография и источники / К. И. Козак; под ред. А.А. Ковалени. – Минск : БГУ, 2006. – 286 с.
16. Кузьменко, В. И. Интеллигенция Беларуси в период немецко-фашистской оккупации (1941 – 1944 гг.): Монография / В.И. Кузьменко. – Минск, БГПУ им. М. Танка, 2001. – 199 с. – С. 137].
17. Літвін, А. М. Акупацыя Беларусі (1941–1944): пытанні супраціву і калабарацыі / А. М. Літвін. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2000. – 288 с. – с. 199
18. Літвін, А. М. Антысавецкія ваенна-паліцэйскія фарміраванні на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. 1941 – 1944 гг. Вытокі. Структура. Дзейнасць: аўтарэф. … дыс. докт. гіст. навук. 07.00.02 / А. М. Літвін ; Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 2000. – 37 с.
19. Літвін, А. М. Трасцянецкі лагер: актуальныя праблемы вывучэння / А.М. Літвін // Мінскае гета. 1941 – 1943 гг.: Трагедыя. Гераізм. Памяць: матэрыялы міжнар. навук. канфер., Мінск, 24 кастрычніка 2003 г. / Гістарычная майстэрня ў Мінску, Міжнародны адукацыйны цэнтр у Дортмундзе і інш.: адк. рэд. В.Ф. Балакіраў, К.І. Козак. – Мінск, 2003. – 208 с.
20. Новікаў, С. Я. Эканамічнае палітыка нацысцкай Германіі ў Беларусі ў 1941-1944гг. (агляд крыніц і германскай гістарыяграфіі 1990-х гг. / С. Я. Новікаў: навук. рэд. Г. А. Космач. – Мінск : МДЛУ, 2002. – 219 с.; Новікаў, С. Я. Беларусь у кантэксце германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны / С. Я. Новікаў : навук. рэд. Э.Р. Іофе. – Мінск : МДЛУ, 2004. – 284 с.
21. Нямецка-фашысцкі генацыд на Беларусі (1941 – 1944): Зб. / Пад рэд. У.М. Міхнюка. – Мінск : БелНДЦДААС, 1995. – 416 с.
22. Розенблат, Е. С. Нацистская политика геноцида в отношении еврейского населения в западных областях Беларуси. 1941 – 1944: автореф. … дис. канд. ист. наук: 07.00.02 / Е. С. Розенблат; Ин-т истории НАН Беларуси. – Минск, 2000. – 18 с.

23. Розенблат, Е. С., Еленская, И. Э. Пинские евреи. 1939 – 1944 гг. / Е.С. Розенблат; И. Э. Еленская. – Брест, 1997. – 312 с.
24. Савоняко, М. Я. Немецко-фашистские лагеря на территории Белоруссии в годы Великой Отечественной войны : автореф.… дис. канд. ист. наук: 07.00.02 / М. Я. Савоняко; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 1993.– 31 с.
25. Соловьев, А.К. Белорусская Центральная Рада: Создание, деятельность, крах / А.К. Соловьев. – Минск : Наука и техника, 1995. – 176 с.
26. Туронак, Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй / Пер. з польскай В. Ждановіч. Каментарыі А. М. Літвіна / Ю. Туронак. – Мінск : Беларусь, 1993. – 236 с. – с. 99.